ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

4 лістапада 1931 г. № 257 (1526)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

АЎЛАДАЦЬ ТЭХНІКАЙ БУДУЧЫХ БОЕК

Даць краіне дзесяткі і сотні тысяч снайпэраў, аўладаць баявой тэхнікай машын—задача комсамолу

Адозва лепшых стралкоў Баўманскага раёну і комсамольскага колектыву заводу Ланцуцкага знашла жывы водгук у радзе гарадзкіх арганізацый комсамолу. Некаторыя з іх (Менск) пачалі практычна рыхтавацца да конкурсу.

Аднак, рад гарадзкіх арганізацый (Віцебск, Барысаў) і пераважная большасьць вясковых прашлі міма гэтай каштоўнейшай ініцыятывы. Ігнараваньне гэтага мерапрыемства зьяўляецца політычна шкодным.

Комсамольская організацыя БССР павінна ліквідаваць такую недацэньку, якая пануе ў радзе месц.

Побач з падрыхтоўкай добрых, першаклясных стралкоў комсамольская організацыя павінна аўладаць майстэрствам будучай вайны, вайны-тэхнікі і машын. Гэта—адна з ударных задач ва ўсёй сыстэме вайсковай падрыхтоўкі нашага Саюзу.

Трэба раз назаўсёды пакончыць з опортуністычнай недаацэнкай вайсковай справы. Зрыўшчыкі вайсковай вучобы павінны быць прыцягнуты да суровай партыйнай і комсамольскай адказнасьці.

З 10-га лістапада пачынаюцца стралковыя спаборніцтвы

Бюро Менгаркому ЛКСМБ пастанавіла ўключыцца ва ўсесаюзны стралковы конкурс.

Комсамольскім колектывам і ячэйкам АСО даручана вынайсьці практычныя мерапрыемствы да правядзеньня конкурсу. Гэтая работа павінна быць скончана не пазьней 10 лістапада.

З 10 лістапада па 10 лютага 1932 г. будуць праводзіцца стралковыя спаборніцтвы ўнутры колектываў і ячэек на здачу норм клясыфікацыі комсамольцаў. У гэты-ж пэрыяд лепшыя комсамольцы-стралкі будуць намінавацца.

З 10 па 23 лютага будуць праведзены агульна-гарадзкія стралковыя спаборніцтвы.

Для трэніровачных стрэльбішчаў комсамольскія ячэйкі і колектывы прымацоўваюцца да ціроў, якія маюцца ў горадзе

Рэалізаваць рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б)

Закончыўшы сваю працу пленум ЦК УсеКП(б) разглядзеў важнейшыя вузлавыя пытаньні нашага соцыялістычнага будаўніцтва: аб чыгуначным транспорце, разгортваньні савецкага гандлю і палепшаньні забясьпечаньня рабочых.

Апошні квартал трэцяга рашаючага году і чацьвёрты заключны ляжаць перад транспортам адказныя задачы. Ужо зараз ён павінен штодзённа скарыстоўваць 66 тыс. вагонаў, каб перавесьці 88 мільёнаў тон грузу. Аднак, штодзённая праваздольнасьць транспорту яшчэ не перавышае 52 тысячы вагонаў.

Такім чынам транспорт, ня гледзячы на палепшаньне работы, усё яшчэ не спраўляецца з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва і зьяўляецца „вузкім месцам“ нашай соцыялістычнай гаспадаркі.

Наяўнасьць абязьлічкі, зрывы таварнай язды, дрэнная організацыя працы, ураўнілаўка, закаранеласьць бюрократызм у паасобных зьвеньнях транспортнага апарату—вось прычыны, якія перашкаджаюць рабоце транспорту.

Пленум ЦК УсеКП(б) з усёй рашучасьцю паставіў пытаньне аб неабходнасьці вывесьці транспорт з вузкага месца і намеціў дзеля гэтага рад конкрэтных мерапрыемстваў.

Вялікая адказнасьць за ажыцьцяўленьне гэтых рашэньняў ускладаецца на комсамольскія організацыі чыгуначнага транспорту. Патрэбна зраз-жа давесьці пастанову пленуму ЦК УсеКП(б) да кожнага комсамольца, да кожнага рабочага. Выкарыстоўваючы работу гаспадарча-разрахунковых брыгад паказаўшых сапраўды бальшавіцкія мэтоды працы (Ворша Віцебск), множыць іх вопыт, дабіцца 100 проц. увядзеньня гаспадарчага разрахунку ва ўсіх зьвеньнях чыгуначнага транспорту. Комсамол павінен з усёй рашучасьцю выступіць на барацьбу з ураўнілаўкай.

Правільнай організацыяй працы дабіцца, каб кожны паравоз працаваў ня менш 9 гадзін у суткі, а кожны вагон ня менш 8. Адна з асноўных задач чыгуначнага транспорту, гэта—аўладаньне тэхнікай.

Комсамол можа і павінен зрабіць надзвычайна многа, аб гэтым выразна сьведчыць вопыт барацьбы аршанскай комсамоліі за здаровы транспорт.

З уласьцівай комсамолу напорыстасьцю патрэбна рашуча дабіцца заканчэньня з закаранеласьцю і бюрократызмам, якія знаходзяць яшчэ месца ў транспортным апараце.

Бальшавіцкія рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б) аб чыгуначным транспорце павінны стаць вядучымі ў рабоце кожнай комсамольскай організацыі чыгуначных вузлоў.

Пленум ЦК УсеКП(б) удзяліў надзвычайна многа ўвагі разгортваньню савецкага гандлю і палепшаньню забясьпечаньня рабочых. Прыняўшы рашэньні аб разгортваньні сеці гандлю, як праз магазыны Наркомснабу і коопэрацыі, так і праз аб'яднаньні лёгкай прамысловасьці ВСНГ, саўгасаў і колгасаў, пленум завастрыў асаблівую ўвагу на якасьць работы нашых гандлёвых організацый.

Кожны комсамолец, асабліва коопэрацыйнай організацыі павінен навучыцца гандляваць па-савецку, па-культурнаму.

Зараз кожная комсамольская ячэйка, асабліва колгасная і саўгасная, павінны зрабіць Савецкі гандаль і забясьпечаньне рабочых стрыжнёвымі пунктамі сваёй работы ні на хвіліну не забываць, што гандаль колгасаў і саўгасаў „павінен разгортвацца толькі пры абавязковай умове акуратнага выкананьня здачы (продажу) продукцыі дзяржаве“.

Пад знакам выкананьня бальшавіцкіх рашэньняў пленуму ЦК УсеКП(б) павінна прайсьці сьвяткаваньне 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі.

Петрыкаўскі РК ЛКСМБ і райсавет АСО сарвалі работу вучпункту

Зімовую вайсковую вучобу комсамольцы Петрыкава распачалі свая часова—з 1 кастрычніка. Заняткі у пункце праходзілі зусім ня дрэнна, за кароткі час комсамольцы аўладалі элементарнымі ведамі.

Аднак, хутка праца вучпункту заглухла. РК ЛКСМБ і райсавет АСОавіяхіму спынілі кіраўніцтва. Ужо некалькі заняткаў сарвана.

Сэкратар райсавету АСО, ён-жа кіраўнік пункту, Сутэк, не зьяўляўся на заняткі, чым сарваў работу вучпункту.

Райком КП(б)Б павінен неадкладна заняцца станам вайсковай вучобы ў організацыі.

А. П.

Ганьба такой рабоце

Церахаўская організацыя комсамолу дрэнна выконвае пастановы IX зьезду УсеЛКСМ аб вайсковай вучобе. Больш 40 проц. організацыі па-за радамі АСОавіяхіму. Ні ў адной ячэйцы не праводзяцца вайсковыя заняткі. Вылучаныя вайсковыя кіраўнікі у большасьці ня маюць ніякага разуменьня аб вайсковай вучобе, дык нічога і ня робяць.

Вайсковай літаратуры і газэт у раёне не знойдзеш, хіба толькі у шафе райосоавіяхіму, якая заўжды пад замком.

Організацыя павінна як найхутчэй ліквідаваць ганебны прарыў у вайсковай вучобе.

Лысенко.

Соцдагавары на лепшую вайсковую падрыхтоўку

Бюро комсамольскага колектыву Белдзяржбуду ўхваліла прапанову першаклясных баўманскіх стралкоў аб ўсесаюзным конкурсе на лепшага комсамольца стралка.

Заняткі на вучпункту Асоавіяхэму

Ліст баўманскіх комсамольцаў, а таксама заводу „Пролетары“, абгаворан на бюро і сходах комсамольскіх ячэек. Выпрацаваны конкрэтныя мерапрыемствы для прыцягненьня комсамольцаў і беспартыйнай моладзі на вайсковыя пункты.

Камітэт арганізоўвае конкурс на лепшага стралка. Цэх'ячэйкі займаюцца вывучэньнем тэорыі і практыкі стралковай справы.

Паміж ячэйкамі заключаюцца соцдагавары на лепшую пастаноўку вайсковай падрыхтоўкі да ўсесаюзнага конкурсу. Для ячэек і комсамольцаў, якія пакажуць лепшыя ўзоры вайсковай падрыхтоўкі, вызначаны рад прэмій.

Кучар

180 комсамольцаў па-за вайсковай вучобай

Сэкратар колектыву „Ноўкі“ ігноруе сыгналы друку

„— Той комсамолец—не комсамолец і актывісты не актывісты, хто не аўладае вайсковымі ведамі так падкрэсьлілі у сваіх рашэньнях комсамольскія зьезды. Між тым опортуністы са шклозаводу „Ноўка“ злосна ігноруюць рашэньні зьездаў. Неаднакротныя сыгналы друку у прыватнасьці „Чырвонай Зьмены“ не зварухнулі бюро комсамольскага колектыву і Сураскі РК ЛКСМБ дагэтуль ня прынята захадаў, узьняць на заводзе вайсковую вучобу, дзе працуе 180 комсамольцаў.

Бюро комсамольскага колектыву нават не палічыла мэтазгодным разглядзець допіс аб вайсковай вучобе, зьмешчаны у „Чырвонай Зьмене“.

— Што практычнага зроблена па зьмешчанаму допісу?—пытаемся у сэкратара колектыву Барады.

— „А я нават і не чытаў яго“

Вось узор безадказных адносін да сыгналаў друку.

У колектыве не праведзена праверка вайсковых ведаў комсамольцаў.

Партыйны колектыў заводу ня кіруе комсамольскай організацыяй. нічога практычнага не зрабіў для наладжваньня вайсковай вучобы.

Опортуністыя, якія ігноруюць вайсковую вучобу, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці

Брыгадзір „ЧЗ“ Манончык.

За ўмовах сусьветнага крызісу расьце рэволюцыйны ўздым

(ЛІСТЫ З КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ НЯМЕЧЧЫНЫ)

Сусьветны экономічны крызіс уступіў у стадыю новага рэзкага абвастраньня. Падзеньне курсу фунта стэрлінгаў і скасаваньне залатога стандарту мелі катастрофічныя міжнародныя вынікі.

Ангельскі ваенны флёт упяршыню ў гісторыі Ангельшчыны ўзьняў штандар барацьбы. Буйнейшыя банкі Нямеччыны, Францыі спынілі плацяжы. Абвастрыліся супярэчнасьці паміж імпэралістычнымі дзяржавамі. Яркай праявай гэтага зьяўляюцца падзеі ў Манчжурыі.

Узмацнілася пагроза інтэрвэнцыі супроць Савецкага саюзу.

Паглыбленьне крызісу надзвычай моцна адбілося на Нямеччыне. Беспрацоўе расьце, беззварчасьць усё больш і больш скачваецца, зачыняюцца прадпрыемствы грамадная колькасьць рабочых выкідаецца на вуліцу.

Пэрспэктывы „па Брунінгу

Яшчэ горшыя пэрспэктывы ўпераздзе. Па думцы Брунінга, колькасьць беспрацоўных у гэтую зіму дасягне 8 мільёнаў.

А на буржуазная газэта піша: трэба растлумачыць нямецкаму рабочаму, што яго асноўным продуктам харчаваньня зьяўляецца бульба“. Бясспомачныя ў сваіх спробах пераадолець крызіс, капіталістыя бачаць выйсьце толькі ў далейшым наступу на рабочую клясу.

Для 3 мільёнаў рабочых, сярод якіх некалькі сот тысяч моладзі, спынена дзейнасьць тарыфных дагавароў з мэтай зьніжэньня зарплаты. Ажыцьцяўляецца яшчэ рад мерапрыемстваў, якія яшчэ больш пагоршаць становішча працоўных мас.

Праводзячы гэтыя мерапрыемствы надзвычайнымі ўказамі, буржуазія, у страху перад актыўным супраціўленьнем рабочае клясы, тымі-ж фашысцкімі мэтодамі імкнецца ўстанавіць у краіне „парадак“. Мяркуецца шляхам надзвычайнага дэкрэту пазбавіць рабочых права забастоўкі.

Пазбавіць права ад беспрацоўных шляхам... высылкі

Высоўваюцца проэкты высяленьня беспрацоўных з гарадоў, высылкі іх у француск'я колёніі і г. д. Буржуазія імкнецца абезгаловіць рэволюцыйны рух, праводзяцца масавыя арышты, уводзяцца вайсковыя суды, забараняюцца комуністычныя газэты.



Дэмонстрацыя нямецкіх комсамольцаў.

Ня гледзячы на гэта, уплыў компартыі і камсамолу ўзмацняецца, расьце рэволюцыйны ўздым.

Асабліва сур'ёзны вынік крызісу для працоўнае моладзі. У Нямеччыне зараз налічваецца звыш мільёна беспрацоўнай моладзі. Фабрычныя вучні масамі звальняюцца. Новы надзвычайны дэкрэт пазбаўляе беспрацоўную моладзь да 21 году дапамогі па беспрацоўю.

У капіталістычнай Нямеччыне працоўная моладзь ня мае ніякіх пэрспэктыў, акрамя самых горшых.

Рабочая моладзь адказвае на пагоршаньне свайго становішча ўсё ўзрастаючым лікам юнацкіх забастовак і дэмонстрацый, актыўнейшым удзелам у барацьбе дарослых. Моладзь пакідае буржуазныя партыі. Соцыял-дэмократыя, гэтая агентура буржуазіі ў радох рабочае клясы, зараз перажывае крызіс зьмены.

Вось умовы у якіх комсамол Нямеччыны змагаецца за выкананьне сваёй асноўнай задачы—заваяваньня большасьці рабочае моладзі на бок комунізму. Ва ўмовах крызісу і надзвычайнага абвастраньня клясавай барацьбы, важнейшым пытаньнем комсамолу зьяўляецца організацыя барацьбы моладзі на прадпрыемствах супроць зьніжэньня зарплаты, супроць звальненьняў, увядзеньня працоўнай павіннасьці.

Рэнэ Мак.

У БССР прыяжджае дэлегацыя Саксонскіх рабочых для ўдзелу ў сьвяткаваньні Кастрычніка

Сёньня а 8-й гадзіне на Менскім вакзале

Для ўдзелу ў сьвяткаваньні гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі ў БССР прыяжджае дэлегацыя рабочых Саксоніі. (Нямеччына)

Дэлегацыя прыяжджае сёньня а 8-й гадзіне ўвечары. Працоўныя Менску організавана сустракаюць замежных гасьцей.

Для сустрэчы дэлегацыі выязджаюць прадстаўнікі менскіх фабрык і заводаў, профсоюзных, комсамольскіх організацый і прадстаўнікі друку.

Замежныя рабочыя ў СССР рыхтуюцца да сьвята Кастрычніка

Ленінград. Замежныя рабочыя, якія працуюць на прадпрыемствах Ленінграда рыхтуюць рад кастрычнікаўскіх падарункаў.

Нямецкія рабочыя заводу імя Козіцкага абавязаліся да 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі зрабіць у няўрочны час тэрміновыя штампы. Нямецкія рабочыя Іжорскага заводу да 7-га лістапада выпускаюць у падарунак 2 нафтавыя насосы, зробленыя звыш пляну.

У блёк-нот прокурора рэспублікі

Пасадзіць на лаву падсудных

БЕЛТОРП і СЭКТАР КАДРАЎ ВСНГБ РАЗВАЛІЛІ РАБОТУ АДЗІНАЙ НА БЕЛАРУСІ ШКОЛЫ ФЗВ МЭХАНІКАЎ-ТАРПЯНІКАЎ

Белторп не клапоціцца

(З гутаркі з часовым загадчыкам Клімавіцкай ФЗВ мэханікаў т. Невядомскім)

Ня гледзячы на сыгналы „Чырвонай Зьмены", Клімавіцкага РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ і пастановы ЦКК-РСІ аб пагражаючым становішчы Клімавіцкай школы ФЗВ—380 фабзавучнікаў і пэдагогічна-інструктарскі склад сталі перад фактам неабходнасьці спыніць работу школы.

Злачынна нядбайнае фінансаваньне школы прывяло к таму, што за 3-4 месяцы ня выплачана зарплата вучням і ?ірскладу ФЗВ.

Вучнёўства сыстэматычна недаядае, не забясьпечана спэцвопраткай. З-за адсутнасьці сродкаў школа зарабляла продукты суботнікамі ў колгасах.

Здабыты сіламі школы пры дапамозе ЦК УсеЛКСМ вострадэфіцытны інструмэнтары, матар'ялы і навучальныя прылады ня выкуплены і распрадаюцца чыгункай з-за адсутнасьцю сродкаў.

Выдзеленыя ставкі Саюзторпам спэцыяльна для школы ФЗВ злачынна раздаюцца заводам, шк ла аб гэтым ня была паведамлена.

Скончэньне будаўніцтва мэханічнага корпусу зрываецца з-за адсутнасьці будматар'ялу, а тэхнічнае кіраўніцтва замест замацаваньня апошняга адклікана Белторпам. Гэта ня гледзячы на тое, што школа будуе шляхам выпрашваньня будматар'ялаў паколькі адсутнічаюць нарады з Белторпу.

Дагэтуль адсутнічае спэцыяліст (тэхнік-мэханік), і кіраўнічы штат школы.

Усё гэта прывяло да масавага бегства са школы. Вучні ФЗВ падаюць заявы аб уходзе на заводы. Зачынена сталоўка, адсутнічаюць матар'ялы і гаручае для мэханічных майстэрань. Ня гледзячы на тэлеграмы РВК, Белторп ніякіх мер ня прымае.

Пагражаючае становішча ўсугубляецца валакітай і бюрократызмам з боку Белторпу. Ня прыняты рашучыя меры і сэктарам прамкадраў ВСНГБ, ня гледзячы на інформацыю аб гэтым. Мы патрабуем умяшательства прокуратуры рэспублікі.

Чакаем слова в цебскай комсамоліі

ВІЦЕБСК. 28. Стан работы школы ФЗВ швэйнікаў яшчэ да гэтага ч су не палепшыўся. Вэнтыляцыя не ўстаноўлена, ня гледзячы на тое, што валынка з устаноўкаю цягнецца больш 2-х год.

ФЗВ на гаспадарчы разрахунак пераходзіць вельмі марудна. Не палепшаны быт вучняў.

Дрэнна пастаўлена выкладаньне спэцыяльных прадметаў. Частка спэцыялістых-выкладчыкаў нядбайна адносіцца да сваёй работы.

Выкладчык машынавнаўства, замест растлумачыць заданьне, толькі раздае падручнікі. Машыны, на якіх трэба замацоўваць тэорэтычную вучобу, папсаваны.

Ня лепш стан ФЗВ Дарбудвучу. Слаба пастаўлена культработа сярод вучняў. Яшчэ горш у ФЗВ будаўнікаў. Будаб'яднаньне не забясьпечвае школу патрэбнымі сродкамі.

Комсамольская організацыя Віцебску не мобілізавала на зьнішчэньне недахопаў і палепшаньне работы школ.

Л. Босы.

Патрабуем умяшаньня прокуратуры

Ня гледзячы на рад перашкод кіраўніцтва Магілеўскага ФЗВ мэталістых з вялікімі цяжкасьцямі адваявала дом пад інтэрнат.

Аднак, Магілеўскі гарсавет, забыўшыся на дырэктывы партыі аб падрыхтоўцы кадраў, штодзённа організоўвае напады на інтэрнат.

„Выкарчаваць гэту шваль адсюль" —заявіў сакратар гарсавету аб фабзайцах і 3-га кастрычніка пачаў выганяць фабзайцаў і выкідаць рэчы на вуліцу.

Мы патрабуем умяшаньня партыйных організацый і прокуратуры Магілеўшчыны.

12.

Не падрыхтаваліся да сустрэчы

Віцебскі ФЗВ шаўцоў адчыніўся ў сьнежні 1929 году. Каля 50 пр. падлеткаў было ўзята з дзіцячых комун.

Зараз адбыўся выпуск школы. Але рад прадпрыемстваў, якія павінны скарыстаць гэтую рабочую сілу, не падрыхтаваліся для сустрэчы. Так, менская фабрыка даслала весткі аб неабходнай колькасьці рабочых, але не падрыхтавала памяшканьня для іх. Гомельская фабрыка не паведаміла, колькі і якія рабочыя ёй патрэбны.

Б-о.



Фабзайцы за работай

ЗА ЖЫЦЦЁ МАЛАДЗЁЖНЫХ СТАРОНАК ЗМАГАЦЦА

Палажыць канец опортуністычнай недацэнцы ролі маладзёжных старонак—абудзіць іх да жыцьця

Шырэй барацьбу за рэалізацыю рашэньняў зьезду рабсельваенкораў, за пуцёўку Сталіна

Комсамольскія колектывы раду прадпрыемстваў ня кіруюць маладзёжнымі старонкамі ў шматтыражках і насьценгазэтах.

Матэр'ял з Случчыны і Карнянчыны сьведчыць аб опортуністычных адносінах комсамольскіх колектываў да рэалізацыі рашэньняў рабсельваенкораўскага зьезду аб кіраўніцтве маладзёжнымі старонкамі.

На жыцьцёвасьць маладзёжных старонак паказвае прыклад опэрацыйнага выхаду штодзёнкі на заводзе імя Варашылава.

Раённыя камітэты, колектывы і ячэйкі комсамолу павінны разьбіць опортуністычную недацэнку ролі маладзёжных старонак у шматтыражках і насьценгазэтах, як організатараў і кіраўнікоў юнкораўскага руху.

За лістапад месяц трэба дабіцца, каб пры ўсіх шматтыражках і насьценгазэтах былі маладзёжныя старонкі. Комсамольскія камітэты павінны забясьпечыць сваё сталае, опэрацыйнае кіраўніцтва гэтымі старонкамі.

Пра маладзёжныя старонкі „забыліся"

Выкананьне дырэктыў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў па Карнянскім раёне праводзіцца дрэнна. Пасьля зьезду організавана раённая шматтыражка, якая не забясьпечвае опэрацыйнага штодзённага кіраўніцтва рабсельскорруху. Маладзёжная старонка пры шматтыражцы не організавана, у выніку юнкоррух ніякага кіраўніцтва не мае. Райкамол гэтай справай не займаецца.

Разгортваньне нізавога друку—насьценгазэт—у раёне надзвычайна дрэннае. Паасобныя комсамольскія ячэйкі выпускаюць насьценгазэты асьвятляючы ход уборкі і насеўную работу. Аднак, ні пры адной з гэтых газэт няма маладзёжнай старонкі.

Бюро райкому комсамолу распрацоўвала пастанову рабсельваенкораўскага зьезду, але вынікаў на сёньняшні дзень яшчэ няма.

Райкому комсамолу неабходна раз-за-раз організаваць пры шматтыражках маладзёжных старонак, забясьпечыць бальшавіцкае опэратыўнае кіраўніцтва імі.

Зорні.

Скарысталі для аб'яў

На Случчыне друк, як колектыўны організатар мас і праваднік генэральнай лініі партыі, некаторымі організацыямі і ўстановамі зусім недацэньваецца. Яшчэ на ўсюды распрацаваны пастановы 2-га рабсельваенкораўскага зьезду.

Насьценгазэты РВК і шавецкай арцелі „Іскра" не выпускаюцца паўгода. З юнкорамі ніякай працы не вядзецца. Аб тым, як бясчынна адносяцца да насьценгазэт і маладзёжных старонак у паасобных месцах сьведчыць факт з шавецкай арцелі „Іскра". Тут насьценгазэта выкарыстоўваецца для аб'яў. Ня гледзячы на рад недахопаў у арцелі насьценгазэта не выходзіць. Трэба зрабіць рашучы пералом у жыцьці паўленай юнкоррух Случчыны. Комсамольская організацыя павінна ўдзяліць больш увагі кіраўніцтву маладзёжнымі старонкамі шматтыражак.

Юнкор „Ч. З," Новік

Аб чыгуначным транспорце

Рэзолюцыя пленуму ЦК па справаздачным дакладу тав. Андрэева, прынятая 29-га кастрычніка 1931 году

1. Заслухаўшы справаздачны даклад НКШЗ, пленум ЦК лічыць ацэнку і вывады, зробленыя Політбюро ў адносінах работы чыгуначнага транспорту ад 5-га кастрычніка г. г. правільнымі, і ў прыватнасьці поўнасьцю ухваляе пастанову аб зьмене кіраўніцтва НКШЗ.

2. Пленум констатуе, што асноўнымі недахопамі ў рабоце чыгуначнага транспорту яшчэ застаюцца: наяўнасьць яшчэ далёка няліквідаванай абязьлічкі і безадказнасьці ў рабоце чыгуначных органаў, пачынаючы із нізавых зьвеньняў і канчаючы НКШЗ адсутнасьць сапраўднай бальшавіцкай барацьбы са зрывамі спаранай язды на цягніках, няўменьне скарыстаць унутраныя рэзэрвы транспорту і дабіцца самай жорсткай экономіі ў выдаткаваньні сродкаў і матар'ялаў. Дагэтуль на чыгуначным транспорце ў пытаньнях зарплаты ў значнай меры яшчэ мае месца ўраўнілаўка, а гасп арганізацыі і профсаюзы не ўзяліся яшчэ за рашучае ўпарадкаваньне організацыі працы, аплаты і паляпшэньня забясьпечаньня. Якасьць рамонту цягнікоў і вагонаў як на заводах „ВОРС", так і ў дэпо ўсё яшчэ застаецца надзвычайна нездавальняючай. Буйнейшым недахопам работы чыгунак зьяўляецца таксама дрэнная пастаноўка справы эксплёатацыі (плянаваньне перавозак, работа станцый, дыспэтчэраў і інш). У значнай ступені асноўнай прычынай усіх пералічаных недахопаў у правядзеньні пастаноў партыі на транспорце зьяўляецца коснасьць і бюрократызм транспартнага апарату і няўменьне кіраўнікоў чыгуначнікаў—комуністаў змагацца з гэтай коснасьцю і бюрократызмам паставіць работу па-новаму і работаць бальшавіцкімі тэмпамі ў справе стварэньня рашучага пералому ва ўсёй рабоце транспорту. Дзякуючы гэтым недахопам чыгуначны транспорт, ня гледзячы на некаторае паляпшэньне сваёй работы параўнальна з мінулым годам, усё яшчэ застаецца вузкім месцам і аднэй з сур'ёзных перашкод у справе паспяховага выкананьня народна-гаспадарчага пляну.

3. Пленум ЦК, побач з гэтым, адзначае нездавальняючае выкананьне з боку паасобных прамысловых аб'яднаньняў і заводаў заказаў транспорту, асабліва па вагонах, цягніках і запасных частках.

4. У забесьпячэньне бесперапыннай работы чыгуначнага транспорта на працягу асеньня-зімовых перавозак, пленум ЦК УсеКП(б) поўнасьцю ўхваляе мерапрыемствы, якія праводзіць і намячае новае кіраўніцтва НКШЗ у напрамку: аздараўленьне паравознага і вагоннага парку, рашучага паляпшэньня якасьці капітальнага і бягучага рамонту: прывядзеньне ў поўны парадак дэпо, поўнай ліквідацыі зрываў у спаранай язьдзе, зьнішчэньня абязьлічкі вагонаў, палепшаньня руху цягнікоў, пашырэньня прапускной здольнасьці і паляпшэньня вадаснабжэньня на ўсіх галоўнейшых напрамках грузапатокаў; ліквідацыі ва ўсіх галінах чыгуначнай гаспадаркі ўраўнілаўкі ў зарплаце, укараненьня прагрэсыўнай зьдзельнай аплаты, рашучага палепшаньня работы апарату НКШЗ і чыгунак, безьлітасна выганяючы ўсе элемэнты коснасьці і бюрократызму: устаноўленьня моцнай дысцыпліны зьнізу да верху, забясьпечыўшы выкананьне кожнага распараджэньня з дакладнай праверкай сапраўднага а не папяровага выкананьня.

5. Пленум ЦК абавязвае ВСНГ СССР неадкладна разгарнуць работу заводаў на вагонабудаўніцтве і паравозабудаўніцтве да скарыстаньня іх поўнай магутнасьці і прапануе СПА не пазьней 1 сьнежня абмяркаваць праграму вагона і паравозабудаўніцтва на 1932 год.

Пленум ЦК прапануе ВСНГ СССР прыняць неадкладныя меры да спэцыялізацыі паравозабудаўнічых заводаў і пераводу з іх на іншыя прадпрыемствы заказаў, ня зьвязаных з новых паравозабудаўніцтвам. Паставіць НКШЗ у чацьвертым квартале запроектаваную колькасьць рэек, дакладак, накладак кастылёў і інш., неадкладна прыняць меры да пашырэньня вытворчасьці рэек. для выкананьня павялічанай програмы на 1932 г; паставіць НКШЗ неабходнае электраабсталяваньне і матар'ялы для паляпшэньне сувязі з важнейшымі вузламі і напрамкамі і поўнасьцю забясьпечыць транспорт абсталяваньнем вадаснабжэньня (катлы, рухавікі, трубы) для ліквідацыі найбольш затрудненых у водаснабжэньні вучасткаў сеткі.

6. У сувязі з выключна важным значэньнем забясьпечаньня чыгуначнага транспорту запаснымі часткамі, прапанаваць СПА НКШЗ тэрмінова прыняць меры да выкананьня заказаў на запасныя часткі на заводах НКШЗ і прамысловасьці, забясьпечыўшы поўнасьцю мэталям выраб запасных частак.

7. прызнаючы усё яшчэ нездавальняючымі выкананьне плянаў снабжэньня чыгуначнікаў і работу транспортнай коопэрацыі, пленум ЦК прапануе Наркомснабу і Цэнтрасаюзу поўнасьцю і своечасова забясьпечыць снабжэньне чыгуначнікаў у адпаведнасьці з разьмерамі харчовых і прамтаварных фондаў, якія устанаўліваюцца ўрадам. Прапанаваць НКШЗ і ЦК саюзу чыгуначнікаў рашуча палепшыць разьмеркаваньне гэтых фондаў па асобных групах чыгуначнікаў, узмацняўшы работу транспортнай коопэрацыі.

8. Пленум ЦК прызнае зусім нездавальняючымі з боку НКШЗ і прамысловасьці тэмпы падрыхтоўкі правядзеньня мерапрыемстваў па рэконструкцыі транспорту ў намечаныя тэрміны і прапануе СПА ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК і СНК не пазьней 1-га сьнежня г. г. разгледзець увесь плян рэконструкцыйных работ чыгуначнага транспорту на 1932 год, выходзячы з неабходнасьці правядзеньня наступных мерапрыемстваў: разгортваньне работ па электрыфікацыі важнейшых напрамкаў Уралу, Донбасу, Кузбасу і пабудову ў 1932 годзе неабходнай колькасьці электравозаў; разгортваньне будаўніцтва цеплавозаў для забясьпечаньня ліній з затрудненым вадаснабжэньнем, а асабліва дробных цеплавозаў для манэўравых і пуцейскіх работ; фарсаваньне рэконструкцыі Луганскага заводу для пабудовы новых больш магутных тыпаў паравозаў; узмацненьне ліній па важнейшых напрамках, асабліва па Донбасу і Уралу; рэконструкцыя такіх вузлоў, як Маскоўскі, Ленінградзкі і Ніжагародзкі; паскарэньне пабудовы новых мастоў праз Волгу, Аку, Об; мэханізацыя пагрузкі і разгрузкі, карэннае паляпшэньне справы сувязі на чыгунках, абсталяваньне рухомага складу аўтотармазамі і на маршрутах замкнутых напрамкаў, аўтасцэпкай і правядзеньне рэконструкцыі рамонтных работ з вызначэньнем групы заводаў для організацыі ў шырокім машгабе вырабу запасных частак і інструмэнтаў.

9. Выходзячы з самай вострай патрэбы чыгуначнага транспорту ў новых кадрах і высокакваліфікаваным моцным апараце кіраўніцтва, пленум ЦК прапануе НКШЗ узмацніць работу па падрыхтоўцы кадраў праз ВТНУ, тэхнікумы і шляхам перакваліфікацыі „движенцев", электрацагавікоў і інш., не адрываючы іх ад работы.

10. У справе карэннага паляпшэньня работы чыгуначнага транспорту, пленум лічыць важнейшай задачай партыі ўмацаваньне комуністычнымі кадрамі зьнізу да-верху ўсіх зьвеньняў апарату кіраўніцтва, асабліва служб руху, перавод актыўных комуністаў, якія вызваліліся на гаспадарчую работу ў якасьці начальнікаў і памочнікаў-начальнікаў станцый, дыстанцый дэпопамочнікаў начальнікаў асобных аддзелаў раёнаў, і дарог і г. д. ЦК лічыць абсолютна няправільнымі і супярэчлівымі інтарэсамі партыі настроі тых комуністаў, якія ня хочуць з партыйнай або іншай работы пераходзіць на нізавую транспортную гаспадарчую работу. Справай гонару комуніста на транспорце павінна быць сапраўднае аўладаньне тэхнікай транспорту, уменьне ў кароткі тэрмін навучыцца і стаць самастойным кіраўніком тэй ці іншай галіны работы ў апараце, ці на лініі. Пленум ЦК абавязвае ЦК нацкампартый, крайкомы і абкомы ўзмацніць сваё кіраўніцтва раённымі і дарожнымі чыгуначнымі парторганізатарамі асабліва значэньне якіх ясна ня толькі ў справе ўмацаваньня партработы на транспорце але і ў падрыхтоўцы і ўкараненьні партработнікаў у гаспадарчы апарат транспорту. Ухваляючы пастанову політбюро аб пераводзе значнага ліку транспортных парторгаў на гаспадарчую работу, пленум ЦК даручае оргбюро камандыраваць новую групу партработнікаў на дарогі і ў раёны ў якасьці парторганізатараў.

11. Адзначаючы ўзмацненьне ўвагі мясцовых парторганізацый да пытаньняў транспорту, пленум ЦК, аднак, констатуе, што нярэдка ўдзел крайкомаў і абкомаў партыі ў транспрабоце абмяжоўваецца толькі фармальнымі дакладамі, справаздачамі і абсьледваньнямі, замест сапраўднай праверкі работы чыгунак і штодзённага конкрэтнага кіраўніцтва з боку парторганізацыі правядзеньнем мерапрыемстваў, якія паляпшаюць работу дэпо, станцый, раёнаў і т. д. (для забесьпячэньня сыстэматычнай дапамогі транспорту з боку абласных і краявых парторганізацый пленум ЦК абавязвае ЦК нацкампартый, крайкомы і абкомы безадкладна вылучыць спэцыяльнага сэкратара выключна для вядзеньня работы па транспорце, вызваліўшы яго ад усякіх іншых абавязкаў).

12. Партыя ня можа дапусьціць у якой-небудзь ступені паўтарэньня зімовых перабояў у рабоце чыгунак. ЦК будзе лічыць мясцовыя парторганізацыі адказнымі за прарывы ў рабоце транспорту на тым ці іншым вучастку. Увага ўсёй партыі і мясцовых парторганізацый павінна быць у яшчэ большай меры згуртавацца на далейшай мобілізацыі мас чыгуначнікаў для паляпшэньня работы паравоза, вагона для павышэньня якасьці рамонту, для паляпшэньня работы станцыі, для ўмацаваньня працдысцыпліны, для рашучага паляпшэньня работы апарата кіраўніцтва, для барацьбы з коснасьцю і бюрократызмам. Павінна быць забясьпечана рашучая барацьба за беражлівае скарыстаньне транспортных сродкаў, вагонаў і паравозаў, скарачэньне ўсякіх прастояў пад нагрузкай і выгрузкай. Неабходна штодзённая праверка і узмацненьне выкананьня заказаў транспорту на прамысловых прадпрыемствах і паляпшэньня якасьці іх продукцыі. Асаблівая ўвага профэсыянальных і парторганізацый павінна быць згуртавана на павышэньне работы нізавых зьвеньняў транспорту (цэху, дэпо, станцыі і дыстанцыі і інш.). У гэтых зьвеньнях павінны быць згуртаваны на надыходзячы пэрыод напружанай работы транспорту кіруючыя кадры профэсыянальных і парторганізацый. Мобілізаваныя вакол баявых пытаньняў, пастаўленых партыяй перад транспортам, павінна ня толькі папярэдзіць паўтарэньне транспортных цяжкасьцяй мінулага году, але наадварот, забясьпечыць павышэньне работы чыгуначнага транспорту для бязумоўнага выкананьня народна-гаспадарчага пляну.

На Любаньшчыне дарогі адрамантаваны!

Усебеларускі суботнік працягнут да 14-й гадавіны Кастрычніка

ЦК ЛКСМБ абвясьціў вымову Асіповіцкаму, Бягомельскаму і Дрысенскаму РК ЛКСМБ

Пляны дарожнага будаўніцтва далёка ня ўсімі організацыямі пастаўлены ў цэнтр увагі.

Зьмешчаная сёньня пастанова ЦК ЛКСМБ яскрава гаворыць аб тым, што паасобныя організацыі недацэньваюць важнасьці поўнага выкананьня плянаў рамонту і будаўніцтва дарог. За бездаказныя адносіны і недаацэнку плянаў Дарбуду ЦК ЛКСМБ абвясьціў вымову Асіповіцкаму, Бягомельскаму і Дрысенскаму райкомам ЛКСМБ.

ЦК ЛКСМБ пастанавіў працягнуць усебеларускі комсамольскі суботнік ліквідацыі бездарожжа да 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі. Гэтыя дні трэба скарыстаць для максімальнага разгортваньня работы па выкананьню плянаў.

Райкомы комсамолу павінны тэрмінова распрацаваць пастанову ЦК, даць канкрэтныя ўказаньні аб поўным забясьпечаньні выхаду рабочай сілы ў вызначаныя дні суботніка.

Сотні новых аўтодараўдаў

Любаньскі комсамол сумесна з раённым саветам Аўтадору правёў у час месячніку штурму бездарожжа вялізарную работу па ўмацаваньню ячэек Аўтадору.

Трэба адзначыць, што да гэтага часу работа па ўцягненьню новых членаў у рады Аўтадору была закінута на задворкі. У час месячніку ўцягнута вялікая колькасьць новых членаў, сабрана сяброўскіх узносаў каля 800 руб.

А. Рабы, Макарэвіч

Усебеларускі суботнік працягнут

З пастановы бюро ЦК ЛКСМБ ад 20 кастрычніка 1931 г. аб ходзе дарожнага будаўніцтва і ўдзелу ў ім ЛКСМБ

1. Бюро ЦК ЛКСМБ адзначае знач ю работу па барацьбе з бездарожжам, праведзеную наступнымі комсамольскімі організацыямі: Полацкая адпрацала 4820 працадзён з прыцягненьнем беспартыйнай моладзі, рвеньская 2700; Краснапольская 7; Бабруйская 632; Веткаўская 213; бровенская 175; Лёзьненская 175, сонская, Асьвейская і іншыя правілі рад мерапрыемстваў: пасадку эў, абкладку бровак дзярном, вяр ўку рабочых на дарбудаўніцтва офства над трактамі.

Бюро ЦК адзначае прыкладную ацу наступных комсамольскіх брыі мобілізаваных комсамольцаў: ыгады Мядзьведзева (Полацк), Вол за (Расонь), Чэрвеньскай і Піруцінай ячэек ЛКСМБ. Адначасова бюро К ЛКСМБ лічыць, што ўдзел комсамольскіх організацый у дарожным даўніцтве яшчэ не дастатковы, і сім нездавальняючы па наступных ган зацыях: Барысаўскай, Круйскай рысенскай, Бягомельскай Сіроцінсй, Віцебскай, Рэчыцкай і Аршанскай.

2 Прапанаваць усім РК ЛКСМБ да анчэньня дарожнага будаўніцтва мо ізаваць усю увагу комсамольскай ганізацыі на поўную нагрузку усіх яўных дарожных мэханізмаў і коже сілы

3. Бюро ЦК ЛКСМБ адзначае, што КСМ да гэтага часу не разгарнулі ічэ маасавай работы па правядзеньсуботніка барацьбы з бездарожм,—абвешчаны ЦК ЛКСМБ суботпрацягнуць да Кастрычнікаўскіх вят.

4. За невыкананьне дырэктывы ЦК моб лізацыі комсамольцаў на дарож е будаўніцтва аб'явіць вымову бю- РК ЛКСМБ Асіпавічы, Бягомля, рыса. Абавязаць усе РК КСМ пад абістую адказнасьць сэкратараў РК кончыць мобілізацыю да 1-га лістада. Лічыць неабходным замацаваць обілізаваных камнябойцаў і брукаў на організаваных курсах.

Дарогі адрамантаваны

Пыроўкую раст і начальную работ правяла комсамольская організаія Любаньшчыны перад тым як йсьці на ўсебеларускі комсамо і суботнік барацьбы з бездарожам.


Навокал ліквідацыі бездарожжа обілізаваны комсамолам шырокія асы колгасьнікаў і аднаасобнікаў обаньшчыны. Гэта д ло вялізарныя зікі ў продукцыйнасьці працы і выкананьні пл наў рамонту і удаўніцтва дарог.

Працоўныя Любаньшчыны прыма актыўны ўдзел у комсамольскім уботніку. На працу выходзілі ўсе рацаздольныя.

Асабліва актыўна праявілі сябе а працы колгасьнікі і аднаасобнікі ачанскага, Юшкоўскага і Рэдкаўага сельсаветаў.

Дарогі на Любаньшчыне адрамантаваны поўнасьцю. Мы патрабуем, б нашаму прыкладу сьледвалі т тнія комсамольскія організацыі.

Макарэвіч, Л. Кардаш



Адрамантаваная дарога

Практычныя вынікі суботніку

Сяляне м. Грэску, уключаючыся ў комсамольскі суботнік штурму бездарожжа, пастанавілі адрамантаваць дарогу, якая ідзе ад м. Грэску да колгасу „Дзядзева". Усе рабочыя былі разьбіты на дзьве брыгады, па 11 чал. у кожнай.

За 9 дзён працы дарога была прыведзена ў належны парадак.

П. Бранавец

Створаем усебеларускі чырвоны абоз імя 14 Кастрычніка

Пачынаньне жлобінскіх комсамольцаў павінен падхапіць увесь комсамол

Усераённы комсамольскі кастрычнікаўскі абоз арганізуюць маладыя бальшавікі Жлобіншчыны

Стан загатовак у Жлобінскім р-не яшчэ не здавальняючы.

Плян з ожжанарыхтовак па раёне выканана на 45 проц., бульбы—на 28 проц. Адгружана бульбы пролетарскім цэнтрам ўсяго 38,5 проц. пляну. Прычыны ў тым, што нарыхтоўчыя організацыі, сельсаветы і рад партыйна-комсамольскіх ячэек не мобілізаваліся на выкананьне загатовак і дагэтуль бязьдзейнічаюць. Кулацка-заможная частка цьвёрдыя заданьні па збожжу выканала толькі на 23 проц, а колькі здала бульбы—невядома бо ўліку не вядзецца.

Колгасы раёну таксама нездавальняюча выконваюць свае абавязкі перад дзяржавай збожжа здана 66 проц. а бульбы 8,4 проц пляну. У паасобных колгасах існуюць буржуазныя спажывецкія тэндэнцыі—праява кулацкай прыказкі: „Найперш сябе, а потым дзяржаве". Старшыня колгасу „11 год Кастрычніка" так і заявіў: „Перш наперш трэба сябе забясьпечыць". Комсамольская ячэйка ня дала рушучага адпору гэтай опортуністычнай практыкі кіраўніцтва колгасу, дый сама аніяк нічога не зрабіла для загатовак.

Зараз, па ініцыятыве „Чырвонай зьмены" і ячэйкі колгасу „Расьсьвет", абвешчана організацыя ўсераённага комсамольскага кастрычнікаўскага абозу. Усе комс. ячэйкі раёну падхапілі гэты пачын і разгарнулі вялікую работу. Організаваны ударныя брыгады пры малацілках транспортныя ўдарныя брыгады, устаноўлены кантрольныя пасты, праводзяцца сходы колгасьнікаў і колгаснай моладзі, сходы аднаасобнай бядняцка-серадняцкай моладзі.

Комсамол Жлобіншчыны ўключыўся ў барацьбу за выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб загатоўках і сустракае вялікі Кастрычнік усераённым комсамольскім абозам.

Комсамолія Беларусі павінна падхапіць гэты пачын.

Організуем на пачыну жлобінскай комсамоліі ўсебеларускі комсамольскі Кастрычнікаўскі абоз.

Брыгада „ЧЗ"
Фіялкін, Князюк, Сініла.

Кіраўніцтва Асіповіцкага райкому ня здолела мобілізаваць масы комсамольцаў

Па-бальшавіцку разьбіць кулацкія, рвацка-месьніцкія тэндэнцыі.

АСІПОВІЧЫ. 3. Гадовы плян хлебазагатовак Асіповіцкім р-нам на 25 кастрычніка выкананы толькі на 15,8 проц. Колгасы выканалі плян хлебазагатовак на 5,8 проц., аднаасобны сэктар—12,4 проц., кулацка-заможныя гаспадаркі ва 27 проц.

Гадовы плян бульбазагатовак выканан на 37,8 проц. колгасы—42,6 проц аднаасобныя гаспадаркі—35,2 проц. і кулацка-заможныя гаспадаркі—39,9 проц.

Надаўзныя вышэй лічбы гавораць аб наяўнасьці права-опортуністычнай практыкі партыйна-комсамольскага і цалкам раённага кіраўніцтва ў правядзеньні такой важнай гаспадарча-політычнай кампаніі, як загатоўкі. Лічбы гавораць і аб тым, што раённае кіраўніцтва ня здолела па-бальшавіцку разгарнуць масавую работу і мобілізаваць масы на выкананьне зусім рэальных плянаў загатовак.

Райколгассаюз ня ўжыў захадаў, каб мобілізаваць масы колгасьнікаў на сваячасовае і поўнае выкананьне плянаў загатовак па колгаснай сыстэме, ня даў бальшавіцкага адпору кулацкім, рвацка-месьніцкім тэндэнцыям, якія мелі месца ў практыцы паасобных колгасаў.

У выніку колгасы Гарадзянскага с-савету гадовы плян хлебазагатовак выканалі толькі на 1,5 проц., Янаўскага—на 2 проц. і Пагарэльскага—на 6,3 проц.

Проэкт папярэдняга разьмеркаваньня прыбыткаў у колгасе „Чырвоная малінаўка" (Янаўскі сельсавет) па сутнасьці быў спажывецка-кулацкім проэктам орыентаваўшым колгасьнікаў на тое, каб не здаваць хлебных лішкаў дзяржаве, за што аўтар проэкту—агроном Імошчанка—выключан з радоў комсамолу.

У чым-жа асноўная шкоднасьць проэкту Імошчанкі?

Графа „хлеб і бульба дзяржаве" аказалася ў проэкце на апошнім месцы. Першымі былі пастаўлены пераўвялічаныя розныя збожжавыя фонды за лік плянаў загатовак, замест здачы ў першую чаргу дзяржаве. Больш таго: проэктам была прадугледжана здача дзяржаве толькі адна ... саломы.

Барацьба з кулацкімі тэндэнцыямі пры разьмеркаваньні прыбыткаў не разгорнута. Кулакі іх агенты не атрымліваюць належнага адпору. Кулаку патураюць. Толькі гэтым можна тлумачыць, што кулацкія гаспадаркі Замоскага с-савету плян хлебазагатовак выканалі толькі на 6,5 проц., Гарадзенскага на 11,5 проц.

Організацыя комсамольскага зналёну правалена ў выніку паўнейшай бязьдзейнасьці комсамольскіх ячэек.

Зараз ужо зроблен пералом. Комсамольская організацыя накіравала свае сілы на фронт хлебазагатовак.

Брыгадзір „Ч. З" Міх. Плашчынскі.

ВА УСЕСАЮЗНЫМ МАРШЫ ПРАВЕРКІ

Добра падрыхтаваныя к зіме сьвінарнікі, корм і догляд—магутныя вагары ў барацьбе за тону-апарос

ЦК ЛКСМБ абавязаў усе комсамольскія організацыі сьвінагадоўчых раёнаў уключыцца ў абвешчанае „Комсамольскай Праўдай" усесаюзнае спаборніцтва за „тону-апарос" і падрыхтоўку жывёлы к зіме.

Мінула ўжо паўтара месяца як выдана гэта пастанова. Аднак, рад комсамольскіх організацый яшчэ не паведаміў аб уключэньні ў спаборніцтва, аб сваіх мерапрыемствах у гэтай галіне.

У другую палову лістапада ўсесаюзны штаб спаборніцтва (організаваны пры беларускім аддзяленьні „Комсамольскай Праўды" і газэце „Чырвоная Зьмена") праводзіць усебеларускую радыё-пераклічку сьвінагадоўчых саўгасаў і комсамольскіх ячэек аб праробленай імі рабоце ў барацьбе за „тону-апарос" і падрыхтоўцы к зіме. Да радыё пераклічкі трэба падрыхтавацца па-баявому, каб рапартаваць партыі лічбамі перамог.

Час, што застаўся да пераклічкі, выкарыстаць для ўдарнай падрыхтоўкі. Дамо жывёле цёплае памяшканьне к зіме, добры корм! Дамо дзяржаве тону мяса з апаросу ў 6-цімесячным узросьце!

„Чорт з імі, няхай спаборнічаюць"

Большасьць комсамольскіх ячэек Крупскага раёну ня ўключылася ва ўсесаюзнае спаборніцтва за тону апарос і падрыхтоўку жывёлы к зіме. У колгасе „Чырвоны Кастрычнік" 100 сьвіней. Гэтыя сьвіньні стаяць у дрэнных сьвінарніках, у брудзе па самыя вушы.

У 1930 годзе колгас распачаў будаўніцтва сьвінарніка на 100 сьвінаматак, але і па сёньня ня скончыў. З-за дрэннага догляду ў колгасе здохла 30 сьвіней. Комсамольская ячэйка ня рыхтуецца к зіме. ня ўключылася ва ўсесаюзнае спаборніцтва комсамолу за тону апарос. Калі комсамольцы запыталіся ў сэкратара комсамольскай ячэйкі, чаму ячэйка ня ўключылася ва ўсесаюзнае спаборніцтва, дык ён адказаў: „Чорт з імі, няхай спаборнічаюць". Ні райком комсамолу, ні партыйная ячэйка ня далі рашучага адпору опортуністычным разважаньням сэкратара комсамольскай ячэйкі.

Такое-ж становішча з развіцьцём сьвінагадоўлі ў колгасе «Іскра». Сьвінарнікі не падрыхтаваны к зіме. Сьвіньні стаяць у брудзе. Больш таго, праўленьне колгасу праводзіць кулацкую політыку разбазарваньня сьвіного матар'ялу—прадае парасят. Комсамольская ячэйка ня выступіла супроць гэтых фактаў, ня ўключылася ў спаборніцтва за тону-апарос.

З гэтага трэба зрабіць вывад, што комсамольскія ячэйкі колгасаў „Чырвоны Кастрычнік" і „Іскра" ігнорую́ць пастанову партыі аб разьвіцьці социялістычнай сьвінагадоўлі і опортуністычна адмежаваліся да ініцыятывы перадавых комсамольскіх організацый.

Райком павінен зрабіць пэўныя вывады ў адносінах к раўнікоў гэтых ячэек.

Алексяёнак Ян.



Узьнімем сьвіньню на комсамольскі шчыт

Клімавічы. Комсамольская ячэйка колгасу „Комунар Магілеўшчыны" з мэтай ўзьняць тэмпы разгортваньня соцжывёлагадоўлі і ліквідаваць прарыў у падрыхтоўцы жывёлы на зіму ўзяла на сябе рад абавязацельстваў: у найкарацейшы тэрмін скончыць будаўніцтва і ацяпленьне сьвінарнікаў, скласьці комсамольскія брыгады па догляду за сьвіньнямі, сыстэматычна праводзіць вытворчыя нарады брыгад, перавесьці ўсю працу на зьдзельшчыну з улікам колькасьці і якасьці, аўладаць тэхнікай сьвінагадоўлі

Каб шчэ больш мобілізаваць увагу шырокіх мас колгасьнікаў на выкананьне адозвы партыі аб разьвіцьці соцсьвінагадоўлі, комсамольцы ўзялі ініцыятыву сваячасова выпускаць насьценгазэту „За социялістычную сьвінагадоўлю".

Комсамольскія брыгады прыступілі да рэалізацыі ўзятых абавязацельстваў шырока разгарнуўшы паміж сабою социялістычнае спаборніцтва і ударніцтва. Праверан стан сьвінарнікаў, праводзіцца іх ацяпленьне. Гэты пачын комсамольцаў „Комунара Магілеўшчыны" павінен быць падхоплен усімі комсамольскімі ячэйкамі Клімавіцкага раёну.

Шырэй разгорнем социялістычнае спаборніцтва, ударніцтва ў барацьбе за падрыхтоўку жывёлы к зіме і тону-апарос

Паўлюк Кавалёў

Чырвоная Зьмена
№ 7
(1526

Двухмесячнік беларусізацыі

Ня заўтра, а СЕНЬНЯ

выступіць у барацьбу за ажыцьцяўленьне задач двухмесячніку

1-га лістапада паводле пастановы III кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ распачаўся двухмесячнік праверкі стану беларусізацыі ў комсамольскай організацыі і ў савецка-гаспадарчым апараце.

Цэлы рад комсамольскіх організацый яшчэ не разгарнулі патрэбнай работы па ажыцьцяўленьню задач гэтага двухмесячніку.

Двухмесячнік беларусізацыі, які павінен зьявіцца магутным вагаром у падвышэньні ўдзелу комсамоліі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, патрабуе максімум увагі ад кожнага камітэту, кожнага колектыву і ячэйкі ЛКСМБ. Вялізарную ўвагу патрэбна аддаць пытаньням ажыцьцяўленьня ініцыятывы рабочых заводу імя Варашылава, накіраванай на разгортваньне ўдарнага руху ў ажыцьцяўленьні беларусізацыі. Кожны комсамолец і самыя шырокія колы працоўнай моладзі павінны быць ахоплены ўдарнымі брыгадамі і гурткамі па вывучэньню беларускай мовы, па вывучэньню эканомікі і культуры Беларусі. Гэта адна з важнейшых задач, якая стаіць перад 2-х месячнікам беларусізацыі і ад выкананьня якой у значнай меры будзе залежаць бальшавісцкая здольнасьць кожнай ячэйкі ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацполітыкі партыі.

Ва ўсёй рабоце па правядзеньню двухмесячніка беларусізацыі комсамольскія ячэйкі павінны аддаць шмат увагі популярызацыі пролетарскай літаратуры, барацьбы за вялікае мастацтва бальшавізму, за комсамольскую тэматыку. У гэтых адносінах комсамольскія організацыі павінны выкарыстаць вопыт Менгаркому ЛКСМБ, які прыступіў да ажыцьцяўленьня цэлага раду практычных мерапрыемстваў.

У двухмесячнік беларусізацыі—паважлівым удзел у барацьбе за гегемонію пролетарскай літаратуры

Гэтымі днямі сакратарыят Менгаркому ЛКСМБ вызначыў цэлы шэраг практычных мерапрыемстваў па ўдзелу Менскай комсамоліі ў падрыхтоўцы да першай конфэрэнцыі Менскай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў.

Прапанавана цэламу шэрагу колектываў на працягу адной пяцідзёнкі забясьпечыць бесьперабойную работу літаратурных гурткоў на прадпрыемствах.

Гарком ЛКСМБ прапанаваў на чарговых сходах комсамольскіх колектываў 11-га лістапада заслухаць даклады пра становішча беларускай і нацменаўскай пролетарскай літаратуры і барацьбы за комсамольскую тэматыку. Гэта павінна быць шчыльна зьвязана з праверкай выкананьня дагавору комсамоліі Менску з МенАПП'ам.

Паводле пастановы ГК ЛКСМБ, колектывы ЛКСМБ павінны зараз-жа распачаць работу па організацыі вечароў сустрэчы з пролетарскімі пісьменьнікамі, папярэдне правёўшы належную падрыхтоўчую работу (мітынгі, вечары рабочай крытыкі і інш.).

За час падрыхтоўкі да конфэрэнцыі МенАПП, якая адбудзецца 15 лістапада, комсамольскія колектывы павінны праверыць свой удзел у справе напісаньня „гісторыі фабрык і заводаў“, дапамагаючы літгурткам у скліканьні нарад старых рабочых, лепшых ударнікаў і ўдарных брыгад з тым, каб прыцягнуць апошніх у актыўную работу па напісаньню „гісторыі“.

Сакратарыят МГК абавязаў колектывы ЛКСМБ прадпрыемстваў, дзе маюцца літгурткі, прыняць актыўны ўдзел у дэлегаваньні на конфэрэнцыі МенАПП лепшых ударнікаў-комсамольцаў, закліканых у літаратуру.

Усе комсамольскія колектывы і ячэйкі павінны неадкладна праверыць бібліятэкі, напоўніць іх беларускай і нацменаўскай пролетарскай літаратурай.

Такія мерапрыемствы, вызначаныя Менгаркомам ЛКСМБ, зьяўляцца магутным сродкам уключэньня мас комсамольцаў у разгорнутую барацьбу за пролетарскую літаратуру і комсамольскую тэматыку. Гэта разам з тым частка баявых спраў, якія павінны быць праароблены комсамоліяй Менску, у час двухмесячніку беларусізацыі.

БЕЛАПАВЕЦ.

Ніякіх мерапрыемстваў...

...Не гледзячы на катэгарычныя наказаньні комсамольскіх і партыйных органаў, на дзяржшклозаводзе „Ноўка“ беларусізацыя ажыцьцяўляецца вельмі дрэнна. У канторы заводу пануе расійская мова. У ЗРК таксама ніхто ня ўжывае беларускай мовы.

Ноўкенская фабрычна-заводзкая сямігодка таксама дрэнна ажыцьцяўляе беларусізацыю. Большасьць настаўнікаў ужывае расейскую мову.

На заводзе ніякіх мерапрыемстваў па ўпартаму і пасьлядоўнаму ажыцьцяўленьню беларусізацыі не ўжываецца.

Заводзкія партыйная і комсамольская організацыя яшчэ не разгарнулі работы па ажыцьцяўленьню задач 2-хмесячніку беларусізацыі.

Якэ.

Недастаткова, таварышы!

У Гомельскай чыгуначнай школе ФЗВ імя Дзяржынскага разгорнута работа па правядзеньню 2-х месячніка беларусізацыі. Комсамольскі колектыў і рэдколегія стаяць на чале гэтай работы, самі гутараць і праводзяць усю працу на беларускай мове. Яны выклікалі пасьледваць іх прыкладу ўсё вучнёўства і настаўніцка-інструктарскі пэрсонал ФЗВ.

У школе організуецца гурток па аўладаньню белмовай уноў уступіўшых і тых хто яшчэ дрэнна ўладае белмовай.

Аднак, гэтага недастаткова. Патрэбна неадкладна комсамольскаму колектыву разгарнуць шырокую работу па вывучэнью нацполітыкі партыі, па ажыцьцяўленьню задач, якія стаяць перад 2-х месячнікам беларусізацыі.

Янка Цімохаў.

Час выйсьці ў бой

У Слуцкім раёне не разгорнута барацьба за ажыцьцяўленьне беларусізацыі на прадпрыемствах і ўстановах. Праводзімы раней 2-х месячнік беларусізацыі ў Слуцкім раёне не даў патрэбных вынікаў. 2-хмесячнік беларусізацыі комсамольская організацыя сустрэла не падрыхтаванай.

Ініцыятыва Варашылаўцаў не знайшла адбітку ў працы прадпрыемстваў г. Слуцку. На прадпрыемствах ня створаны гурткі па вывучэньню белмовы і эканомікі БССР. Насьценгазэты ў большасьці выпадкаў выдаюцца на расійскай мове, рабочыя ў штодзённым жыцьці ўжываюць расійскую мову.

Слуцкі РК ЛКСМБ павінен неадкладна разгарнуць работу па выкананьню задач, якія стаяць перад 2-х месячнікам беларусізацыі.

Новік Я

Абгаварваем „Наша Сонца“.

31-га кастрычніка ў рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ было наладжана абгаварэньне новай комсамольскай аповесьці Барыса Мікуліча „Наша сонца“. Пасьля азнаямленьня з першай часткай і чытаньня аўтарам другой часткі аповесьці, былі разгорнуты спрэчкі.

Тав. Вярнікоўскі (р-цыя „ЧЗ“) адзначыў, што тав. Мікуліч як можна судзіць гэта па другой частцы аповесьці, ня даў глыбокага паказу комсамолу. Местэчковае буржуазнае асяродзьдзе надзвычайна выпячваецца, аўтар шмат увагі аддае кляса-чужому. А гэтаму ня змог ва ўсёй моцы, ва ўсёй велічы супроць ставіць комсамол, партыю, усе тое новае, што ў нас ёсьць і што перамагае над старым. У аповесьці шмат элемэнтаў імпрэсіянізму, эстэтызму.

Тав. Ліхадзеўскі (сакратар ячэйкі ЛКСМБ пісьменьнікаў) лічыць асноўным недахопам у аповесьці перавагу апісаньня над паказам. У аповесьці мала дзеі. Уведзеныя дакумэнты контр-рэволюцыйнай дзейнасьці нацыянал-дэмакратаў органічна не зьвязаны з падзеяй. Комсамолец Калесьнікаў неправільна разумее Бухарына, аўтар жа гэтага ня выкрывае. Увогуле—ня гледзячы на паказаныя недахопы, аповесьць робіць смелыя крокі ў паказе комсамолу. Аповесьць ставіць цэлы рад проблем.

Тав. Швэйдэль (рабочы-ўдарнік друкарні імя Сталіна) адзначае, што стыль першай часткі аповесьці не адпавядае другой часткі. Шэраг вобразаў у аповесьці не зразумелы для сярэдняе масы чытачоў. Вобраз: рабін Калмановіч падобен на хрыста Врубіля, цяжкі і не зразумелы.

Тав. Сокал (старшыня бюро цэнтральнай рабочай студыі) адзначыў што аўтар у паказе беспрытульнасьці не пазбавіўся той памылкі, якая дапушчана ў „Пуцёўцы ў Жыцьцё“. Соцыяльная абумоўленасьць беспрытульнасьці не правільна паказана.

Тав. Буза (рабочы базы БДВ) лічыць хібай аповесьці тое, што шмат увагі аўтар аддае каханьню—і на фронце і ў мястэчку. А мястэчка ўзята дужа глухое—цяжка знайсьці гэтакае ў нашы дні.

Абгаварэньне аповесьці „Наша сонца“ ня скончана. 9-га лістападу працяг абгаварэньня аповесьці Барыса Мікуліча. Аўтор прачытае 3-ю частку аповесьці, пасьля чаго будуць разгорнуты спрэчкі па ўсёй аповесьці.

Міх.

Кармянскі комсамол мобілізаваўся

Комсамол Кармянскага раёну пасьля сыгналаў „Чырвонай Зьмены“ уключыўся ў барацьбу за разгортваньне соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Пленум райкому КСМ, які адбыўся на днях, вынес пастанову аб тым, каб комсамольцы здалі для комплектаваньня сьвінаводчых таварных фэрм 500 сьвінаматак і 50 кароў для МТФ.

Абвешчана штурмавая дэкада па падрыхтоўцы жывёлы да зімоўкі. Мобілізавана 50 комсамолак для догляду за сьвіньнямі. Лепшыя комсамольцы вылучаюцца загадчыкамі колгасных таварных фэрм, для падрыхтоўкі іх будуць праведзены раённыя курсы.

Зараз комсамольская організацыя раёну пераключылася на выкананьне ўзятых пленумам абавязкаў:

Астапота М. К.

ПА БССР

(Па тэлефону і тэлеграфу ад ударных брыгад і юнкораў „Чырвонай Зьмены“)

Жорстка ўдарыць па опортуністычных настроях

Комсамольскі колектыў заводу „Пролетары“ яшчэ дагэтуль не наладзіў політвучобы. У колектыве каля 100 чал. навічкоў і ўсе яны не ахоплены вучобай. Бюро гаркому такую працу прызнала опортуністычнай і прапанавала колектыву да 10 кастрычніка распачаць вучобу. Але бюро колектыву, па чале з сакратаром тав. Лісковічам, працягвае бязьдзейнічаць.

Опортуністы Лісковіч лічыць, комсамольцы ў політшколу ня ідуць і наогул, што гэта „гіблая“ справа.

Гарком ЛКСМБ і парткалек... заводу „Пролетары“ павінны ...стка ўдарыць па опортуністычных настроях кіраўніцтва. Вучоба ... заводзе «Пролетары» павінна ... організавана.

Брыгада „ЧЗ“ А. М., ...

У опортуністычным забыцьці

Кармяны. Комсамольская організацыя раёну не займаецца пытаньнямі рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб сярэдняй і пачатковай школе. Комсамольскія ячэйкі да гэтага часу не прапрацавалі гэтых важнейшых дырэктыў партыі.

У той-жа час комсамолія надзвычайна дрэнна шэфствуе над усеабучам. Стан політтэхнізацыі школ не задавальняючы. Ні ў адной школе няма майстэрні, акрамя ШКМ. Політэхнізацыяй ліч... што вучні выходзяць у колгас ... капаць бульбу, убіраць каноплі.

РК ЛКСМБ павінен забясьпечыць неадкладны паварот усяе комсамоліі тварам да шэфства над усеабучам.

Юнкор Ян. Гарасіменка

Комсамолія „Бальшавіка“ рыхтуецца да перавыбараў

Комсамольская організацыя заводу „Бальшавік“ уключылася ў самаправерку працы завозкіх і цэхавых профкамітэтаў. Ва ўсіх цэхах організаваны комсамольскія брыгады па праверцы, праца брыгад асьвятляецца ў штодзёнках.

Брыгады першага цэху выклікалі на соцспаборніцтва брыгады другога цэху.

За лепшую падрыхтоўку і правядзеньне перавыбараў цэхкомаў завкомаў вызначыў прэміі: лепшаму цэху—200 р., лепшай брыгадзе 100 р., лепшай штодзёнцы—25...

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да перавыбараў завкому прымае піонэр-база. Піонэры праводзяць гутаркі з рабочымі, рыхтуюць вунсі.

Зараз комсамольская організацыя павінна шляхам распрацоўкі адозвы ЦК УсеЛКСМ палепшыць якасьць свайго ўдзелу ў перавыбарах ф... завкому.

Кутма...

Разгарнулі падрыхтоўку

Бабруйск 27. Комсамольскі колектыў Дрэваапрацоўчага комбінату разгарнуў шырокую падрыхтоўчую працу да агульна-комбінацкага зьлёту юнкораў, які павінен будзе праходзіць разам з усімі комсамольскімі актывам.

Зьлёт мае на мэце абгаварыць наступныя пытаньні;

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну за 3-ці квартал, задачы 4-га і конкрэтны ўдзел юнкораў.

2. Ход рэалізацыі пастаноў 2-га зьезду рабсельваенкораў.

Па 5-ці буйнейшых цэхах (маладзёжны, фанерны, ФЗВ, лесапільны, стандартны) будуць праведзены цэхавыя і пазьменныя зьлёты юнкораў. У цэнтры ўвагі стаіць пытаньне рэалізацыі паасобных маршрутаў сталінскай пуцёўкі, ...алізацыя пастаноў 2-га зьезду рабсельваенкораў і конкрэтны ўдзел юнкораў у рэалізацыі сталінскай пуцёўкі.

У кожным цэху наладжваюцца выданьні штодзёнак, якія будуць асьвятляць ход падрыхтоўкі зьлёту. Організаваны пазьменныя рэйды юнкораў па праверцы с...ну рэалізацыі сталінскай пуцёўкі ў цэху.

Н. Д.

Узмацніць работу

Комсамольская ячэйка ткацкага цэху шчотачнай фабрыкі прыступіла да вярбоўкі рабочых у ашчадкасы і ахопу ўсіх рабочых падпіскай на пазыку „3-ці рашаючы“. Аднак, работа па ўцягваньню комсамолу ў правядзеньне фінэстафеты разгорнута надзвычай слаба.

Ячэйка павінна да кастрычніцкіх сьвят дабіцца выкананьня ... проц. кантрольнага заданьня чацьверты квартал.

Сяргеева.

Першая конфэрэнцыя МенАПП

Сакратарыят Менскай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў пастанавіў:

З 15 па 19 лістапада склікаць першую конфэрэнцыю Менскай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў разам з рабочымі-ўдарнікамі закліканымі ў літаратуру. Парадак дня:

1. Чацьверты год пяцігодкі і задачы пролетарскай літаратуры (даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча).

2. Сучасная беларуская літаратура і задачы МенАПП (даклад т. Бэндэ).

3. Першыя вынікі заклiку ўдарнікаў у літаратуру даклад (т. А. Александровіча).

4. Паказ герояў пяцігодкі ў беларускай пролетарскай літаратуры (даклад т. Кучара).

5. На конфэрэнцыі працуюць секцыі: поэзіі прозы, драматургіі, нарысу і крытыкі.

На конфэрэнцыю запрошаны прадстаўнікі: Маскоўскай, Харкаўскай, Тыфліскай, Ленінградзкай, Смаленскай і раённых асоцыяцый Беларусі: Гомельскай, Віцебскай і Бабруйскай.

Сакратарыят МенАПП пастанавіў да конфэрэнцыі выдаць зборнік творчасьці рабочых-ударнікаў на беларускай і яўрэйскай мовах, таксама ў дзень адчыненьня конфэрэнцыі выдаць друкаваную літаратурную газэту аднадзёнку.

Адчыненьне конфэрэнцыі адбудзецца 15 лістапада, а 7 гадзіне, Доме Комуністычнай Асьветы.

Адказны сакратар МенАПП
Андрэй Александровіч

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСА...

4 лістапада роўна а 7-й гадз. ўвечары, у памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі Менгаркому ЛКСМ і рэдакцыя газэты „Чырвонай Зьмена“ паўторна склікаюць нараду ўпаўнаважаных друку комсамольскіх колектываў і яч. па пытаньню: стан распаўсюджваньня комсамольскага друку па Менску.

Яўка абавязкова без спазьненьня.

Менгарком ЛКСМБ
Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.